ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 67 (1336) ‖ ПАНЯДЗЕЛАК, 23-га сакавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90
6 месяцаў . . . 1 р. 80
1 год . . . 3 р. 60
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.
Кошт асобнага №—2 кап.

Штурмавая брыгада ЦК ЛКСМБ і газ. „Чырвонай Зьмены“

ПЛЯН БУДЗЕ ВЫКАНАН-- ТАК АДКАЗАЎ КОМСАМОЛ УКРАІНЫ!

г. ЧУГУЕЎ. 19 (па тэлеграфу ад нашага спэцкора). „У газэце „Комсамолец Украіны“ 18-га сакавіка зьмешчан адкрыты ліст ЦК ЛКСМБ аб ліквідацыі прарываў у вырабе і адгрузцы сельска-гаспадарчых машын для БССР, а таксама і адказны ліст за подпісам сэкратара ЦК ЛКСМУ—тав. Галеева, у якім гаворыцца: ЦК ЛКСМУ адказвае на ліст Беларускага комсамолу і заклікае ўвесь комсамол заводаў і калгасаў Украіны прыняць рашучыя меры да выпуску і адгрузкі сельска-гаспадарчых машын.

Дэталёва абгаварыўшы ліст на сходах комсамолу і рабочых заводаў, яшчэ больш згуртаваць агонь барацьбы на выкананьне і перавыкананьне промфінпляну“.

Разам з гэтым, ЦК ЛКСМУ прапанаваў комсамольскім організацыям наладзіць комсамольскі кантроль над адгрузкай сельска-гаспадарчых машын.

Х. Бацьвінін.

Апошні этап падрыхтоўкі-- на звышударныя тэмпы!

ЦК ЛКСМБ АБВЯСЬЦІЎ МЕСЯЧНІК БАЯВОЙ ВЯСЕНЬНЯЙ ТРЫВОГІ КОМСАМОЛУ

Практычныя мерапрыемствы ЦК ЛКСМБ па рэалізацыі пастановы пленуму аб месячніку баявой трывогі комсамолу па падрыхтоўцы і правядзеньню вясновага севу

У выкананьне пастановы пленуму ЦК ЛКСМБ аб падрыхтоўцы і правядзеньні месячніку баявой трывогі па праверцы і правядзеньню вясновага севу, правесьці наступныя мерапрыемствы.

Мобілізаваць 300 чалавек комсамольскага актыву, каб дапамагчы раёнам і ячэйкам падрыхтавацца і правесьці вясновы сеў, організаваць сустрэчныя пляны ў колгасах і вёсках да сяўбы праверыць як выконваюцца дырэктывы партыі, ураду і комсамолу па гэтаму пытаньню.

Актыў мобілізаваць з наступных раёнаў: Менск—100 чалавек, Віцебск—70 чал., Гомель—70 чал. Горкі.—30 чал.

З цэнтральнага актыву мобілізаваць наступных т. т.:

па ЦК ЛКСМБ—Гуткін, Рубінчык, Гугікаў, Пэрліна, Рудніцкі, Гэйдэ;

па ЦБ ДКА—Хургель, Гасьпяровіч, прадстаўнікоў проф. і гаспадарчых організацый—Ланідус, Гурын, Дубаў, Курган, Гольдбэр, Самдоў, Малей, Галкін, Вайнштэйн, Гефен, Вэнзэль.

Адказнасьць за мобілізацыю 300 ускласьці на тав. Гэйдэ, а па Менску—на тав. Янковіча і Пацукова, Віцебску—Левіна і Рудніцкага, Гомелю—Камісарчыка і Гэйдэ, Горках—Шабеку і Будава.

Брыгады пасылаюцца ва ўсе раёны, за выключэньнем Менску, Віцебску, Гомеля, Бабруйску, Магілева, якім прапануецца дадаткова мобілізаваць патрэбную колькасьць актыву для абслугоўваньня свайго раёну.

Менскім актывам ахапіць наступныя раёны:

Бягомельскі, Бярэзінскі, Грэскі, Заслаўскі, Капыльскі, Койданаўскі, Лагойскі, Плешчаніцкі, Пухавіцкі, Смалявіцкі, Сьмілавіцкі, Вузьдзенскі, Холопеніцкі, Чэрвенчскі, Асіпавіцкі, Глускі, Клічаўскі, Любаньскі, Гарыцкі, Старадароскі, Старобінскі, Сьвіслацкі, Чырвона-Слабодзкі, Крупскі, Талочынскі, Коханаўскі, Круглянскі, Бялыніцкі, Чэчэвіцкі, Чарэйскі.

Гомельскім актывам ахапіць раёны:

Брагінскі, Буда-Кашалеўскі, Боткаўскі, Камарынскі, Лоеўскі, Уваравіцкі, Хойніцкі, Церахаўскі, Чачэрскі, Жыткавіцкі, Азарыцкі, Капаткевіцкі, Каралінскі, Лельчыцкі. Нараўлянскі, Петрыкаўскі, Тураўскі, Юр'яніцкі, Кармянскі, Журавіцкі, Прапойскі, Быхаўскі.

Праз 2-3 дэкады рад раёнау БССР таксама выедуць у поле.

Каб забясьпечыць 30 проц. колектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, пашырыць агульную пасеўплошчу рэспублікі, выканаць плян кантрактацыі ўсяго яравога пасеву, дабіцца сапраўды бальшавіцкай перамогі ў другую колгасную вясну—трэба за гэтыя дні ўсю падрыхтоўчую працу правесьці на звыш ударныя тэмпы.

Выходзячы з гэтых задач, Бюро ЦК ЛКСМБ абвясьціла месячнік баявой трывогі комсамолу для падрыхтоўкі і непасрэднага правядзеньня сяўбы. На дапамогу мясцовым організацыям накіроўваюцца 300 актывістых.

Вясеньняя трывога комсамолу павінна стаць магутнай дэмонстрацыяй комсамольскіх сіл, мобілізацыяй увагі грамадзкавьці на барацьбу за бальшавіцкую сяўбу.

Менская, Бабруйская і інш. комсамольскія організацыі распачалі ўдарна рыхтавацца да пробнага выезду ў поле. Задача ўсіх комсамольскіх організацый БССР дабіцца правядзеньня ўсебеларускай дэкады пробнага выезду ў поле, устанавіўшы яе з 1-IV па 10-IV.

Дэкада комсамольскага пробнага выезду ў поле павінна ператварыцца ў вялікую масава-палітычную кампанію за новы магутны колгасны прыліў, за масавае ўтварэньне сустрэчных плянаў вясеньняй сяўбы па колгасах і аднаасобным сэктары.

Вучнёўская брыгада-цэх арцелі „Пролетары“



НА ЗДЫМКУ: ударная комсамольская брыгада заводу „Чырвоны Мэталіст“, за рамонтам сельска-гаспадарчага інвэнтару ў колгасе „Чырвоная Армія“, Віцебскага раёну.

Віцебскім актывам ахапіць раёны:

Бешанковіцкі, Высачанскі, Гарадоцкі, Лёзьненскі, Межанскі, Сіроценскі, Сураскі, Сеньненскі, Чашніцкі, Асьвейскі, Валынецкі, Ветрынскі, Вульскі, Вушацкі, Дрысенскі, Лепельскі, Расонскі, Лядлянскі, Дубровенскі, Копыскі, Шклоўскі.

Горацкім актывам ахапіць раёны:

Багушэўскі, Горацкі, Дрыбінскі, Мсьціслаўскі Расьнянскі Касьцюковіцкі, Клімавіцкі, Краснапольскі, Крычаўскі, Хоцімскі, Чавускі, Чэрыкаўскі.

Брыгада складаецца з трох чалавек, з адказным брыгадзірам на чале, які адказвае за працу брыгады і робіць справаздачу перад ЦК ЛКСМБ.

Мобілізацыю і пасылку брыгад на месцы скончыць не пазьней 25-III. Тэрмін прабываньня брыгадзіраў вызначыць да 1-V—31 г.

Даручыць тав. Рудніцкаму дамовіцца з Хлебажывёлаводсаюзам, ільнаводсаюзам, Садагародсаюзам, канторай сьвінавода, Галоўлёнкомам аб водпуску неабходных сродкаў.

Плян опэрацыйнага кіраўніцтва

На працягу месячніку баявой трывогі праверкі і падрыхтаванасьці да вясновага севу правесьці агляд і заслухаць на бюро ЦК справаздачы аб ходзе падрыхтоўкі да правядзеньня весновага севу наступныя раёны і ячэйкі ЛКСМБ.

Раёны тэхкультур і МТС

Гарадоцкі РК і ячэйку буйнага колгасу тэхнічных культур.

Асьвейскі РК і сэктароў ячэек МТС.

Барковіцкі РК і саўгас тэх. культур (заслухаць 15-IV).

Маладыя трактарысты-ўдарнікі

На здымку: група ўдарнікаў саўгасу „Вішнёўка“, якія высунулі сустрэчны плян ворыва на 75 га звыш пляну.

Раёны жывёлагадоўлі, сьвінагадоўлі і МТС

Капыльскі раён, ячэйкі МТС і сьвінаводчы колгас.

Любаньскі раён, комуны БВО і саўгас „10-годзьдзя БССР“ (заслухаць 20-IV

Прыгарадныя плодсадовагародныя гаспадаркі

Гомельскі РК, ячэйку прыгараднага садовагароднага саўгасу і колектыву заводу Сельмаш.

Менскі гарком, ячэйкі малочнага і садовагароднага саўгасу і колгасу (заслухаць 25-IУ).

Прапанаваць орг. інструкт. аддзелу і сельгасп. сэктару забясьпечыць агляд раёнаў адпаведнымі брыгадзірамі і далажыць на бюро ЦК.

Акрамя гэтых раёнаў, у парадку опэрацыйнага кіраўніцтва па гэтых пытаньнях, заслухаць на бюро ЦК наступныя раёны:

Жывёлаводчыя раёны:

Камарынскі, Койданаўскі, Лельчыцкі, Хойніцкі, Касьцюковіцкі Чачэвіцкі—30-III.

Тэх. культур: Багушэўскі, Дубровенскі, Межанскі, Сіроценскі Бешанковіцкі, Бабруйскі РК з колектывам заводу „Комбінат“—10-УІ.

Сакратаром вышэйпаказаных РК і брыгадзірам ЦК забясьпечыць падрыхтоўку матар'ялаў к дакладу на бюро ЦК, характарызуючы ўдзел комсамолу ў правядзеньні вясновага севу.

Рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“ ва ўсіх цэнтральных установах, зьвязаных з вясновым севам, і ў спэцыялізаваных раёнах буйных саўгасаў і колгасаў, а таксама і ў вёсках, організаваць кантрольныя пасты газэты для організацыі і кантролю ў падрыхтоўцы і правядзеньні вясновага севу.

Правесьці агляд работы МТС, іх падрыхтоўку і правядзеньне імі вясновa-пасеўнай кампаніі, а таксама работу комсамолу.

Організаваць перадавымі раёнамі грамадзкі буксір для адстаючых (пасылка брыгад, дэлегацый, організацыя чырвонай і чорнай дошкі).

РК і ячэйкам мобілізаваць „ЛК“, каб праверыць падрыхтоўку да правядзеньня вясновага севу. Абвясьціць усебеларускі налёт „ЛК“ па ўсёй Беларусі, пачынаючы з цэнтральных раённых устаноў і канчаючы ячэйкай, для праверкі падрыхтоўкі іх да правядзеньня вясновага севу. Днём праверкі ўстанавіць 1-га красавіка.

Для опэрацыйнага штодзённага кіраўніцтва пры ЦК ЛКСМБ стварыць пяцёрку ў складзе т. т. Гуткіна, Рудніцкага, Дубава, Кургана і Дамарацкага.

Пры РК утварыць тройку, на чале з сэкратаром РК, з прадстаўнікоў райколгассаюзу і РКК РСІ. Пры ячэйках адказнасьць за опэрацыйнае кіраўніцтва ўскладаецца на сэкратара і бюро ячэйкі ЛКСМБ, а ў буйных саўгасах і колгасах утварыць тройкі з прадстаўніка праўленьня колгасу, сэкратара ячэйкі і ўдарніка.

Прапанаваць РК і ячэйкам ЛКСМБ у сябе на мясцох скласьці аналёгічныя пляны опэрацыйнага кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеньнем вясновага севу, якія-б забясьпечылі кантроль над сваечасовым выкананьнем дырэктыў партыі, ураду і комсамолу. Ахапіць праверкай усе ячэйкі, а ў ячэйках усіх комсамольцаў, прыцягнуўшы колгасную і аднаасобную бядняцка-серадняцкую моладзь.

Устанавіць, як правіла, складаньне інформацыйных зводак з ячэйкі ў раёны і з раёну ў ЦК, 10-дзённыя зводкі —9,19 і 29. Інформсэктару ЦК кожную 10-дзёнку падагульваць увесь матар'ял па вясноваму севу, выпрацаваўшы патрэбныя для гэтага адпаведныя статыстычныя зводкі.

КОЛГАС „ЧЫРВОНЫ МАЯК“ НАПАГАТОВЕ

Комсамольская ячэйка колгасу „Чырвоны Маяк“ шырока разгарнула працу па падрыхтоўцы да другой колгаснай сяўбы. Зараз колгас гатовы выйсьці ў поле: насенныя фонды складзены, збожжа ачышчана, інвэнтар адрамантаваны.

За час ударнай падрыхтоўчай працы ў колгас уступіла 13 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Побач з гэтым, ячэйка організавала ў вёсцы Шуляках колгас „Чырвоная Зорка“ з 18 гаспадарак. Новаорганізаваны колгас пры дапамозе комсамольскай ячэйкі ўдарна рыхтуецца да вясеньняй пасеў кампаніі.

Сельсавет цалкам накіраваў сваю працу на ўзмацненьне тэмпаў колектывізацыі і колектывізаваны ўжо на 25 проц.

Юнкор Янка Дымаў

„Усе на ўмацаваньне колгасу“



Аднаасобнікі дапамагаюць.

Даёш баявыя тэмпы!

Прамова сэкратара ЦК ЛКСМБ тав. ПАЛЯКОВА на III усебеларускім зьезьдзе колгасьнікаў



Ленінцам барацьбітам за колгасны Перакоп—дэлегатам 3-га Усебеларускага Зьезду колгасаў ад імя ЦК ЛКСМБ і яго стотысячнай арміі маладых ленінцаў,—баявое прывітаньне. (Воплескі).

Таварышы, 3-ці зьезд колгасьнікаў Беларусі мае вялікае гістарычнае значэньне. Пройдзены шлях з часу першага і другога зьездаў зьяўляецца асаблівым у тых адносінах, што да другога зьезду колгасы зьяўляліся іскрай таго разгарэўшагася полымя, які мае зараз колгасны рух, які ператвараўся ў масавы рух батрацкіх, бядняцкіх і серадняцкіх мас у колгасы.

Да трэцяга колгаснага зьезду мы прышлі з той ацэнкай, якую дала партыя і 6-ы Усесаюзны Зьезд Саветаў аб тым, што цяпер апорай савецкай улады на вёсцы зьяўляюцца колгасьнікі.

У гэтай рабоце ганаровае месца займае ленінскі комсамол і кіруемая ім рабочая і сялянская моладзь. У барацьбе за колгасы, за новы прыліў, за організацыю працы мы мелі ня мала героічных дзеяньняў работы ленінскага комсамолу.

Перад Усебеларускім зьездам колгасаў стаіць баявая задача падагуліць вынікі пройдзенага гістарычнага шляху на фронце колектывізацыі, далейшыя тэмпы нашай работы, якія-б адпавядалі ажыцьцяўленьню лініі партыі—к канцу пяцігодкі колектывізацыю ў асноўным закончыць. Гэта значыць, што мы павінны зараз рашуча разгарнуць наступ на кулака, ліквідаваць яго як клясу на базе суцэльнай колектывізацыі. Адсюль патрабуецца організацыя вялізарнага магутнага руху, прыліву батрацкіх і бядняцка-серадняцкіх мас у колгасы і замацаваньне існуючых зараз колгасаў.

Для ленінскага комсамолу мае вялікае значэньне проблема кадраў. У пытаньні падрыхтоўкі кадраў для тых новых задач, якія прад'яўляе колгаснае будаўніцтва, зараз у нас становішча з рук вон дрэннае. Мы на гэта зварочваем увагу зьезду, каб на гэтую проблему, як адну з важнейшых у справе замацаваньня новых колгасаў, была зьвернута належная ўвага, каб былі падрыхтаваны такія кадры, якія-б забясьпечылі не толькі агульна-адукацыйна падрыхтаваных людзей, але і спэцыялістых у суадпаведнасьці з перабудовай сельскае гаспадаркі,—на аснове машынізацыі і спэцыялізацыі.

Няма ніякага сумненьня, што ўсе задачы, якія стаяць перад Усебеларускім колгасным зьездам, мы, пад кіраўніцтвам нашай партыі, вырашым і далей, пойдзем наперад пад лёзунгам—даёш баявыя тэмпы колектывізацыі! (гучныя воплескі).

„ПАРТЫЯ ВЯДЗЕ НАС ПА ПРАВІЛЬНАМУ ШЛЯХУ"

Новым папаўненьнем колгасных радоў сустрэнем другую бальшавіцкую

З ЗАЛІ ЗЬЕЗДУ

Пазаўчора на зьезьдзе колгасьнікаў, пасьля дакладу сэкратара ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіча аб міжнародным становішчы, разгарнуліся спрэчкі. Выступіла каля 20 дэлегатаў.

Дэлегат зьезду, аднаасобнік т. Аўласенка, прасіў зьезд лічыць яго дэлегатам не аднаасобнікам, а колгасьнікам.

Усе выступіўшыя ў спрэчках дэлегаты адзначалі, што неабходна яшчэ больш разгарнуць работу па колектывізацыі.

Трэба больш рашуча змагацца з кулаком і яго агентурай—опортуністымі,—так аднадушна заяўлялі дэлегаты ў спрэчках.

У сваіх выступленьнях яны заастралі ўвагу на пытаньнях падрыхтоўкі і бальшавіцкага правядзеньня вясновай пасеўнай кампаніі.

Дэлегат тав. Ігнатаў унёс прапанову аб зборы сродкаў на самалёт „Колгасьнік Беларусі". Тут-жа ўнёс 10 рублёў. Дэлегатамі сабрана 103 рублі.

На вячэрнім пасяджаньні зьезду з дакладам аб выніках колгаснага будаўніцтва выступіў старшыня Колгасцэнтру—тав. Міцкоў.

Дэлегаты наведалі вечары змычкі з рабочымі—ударнікамі менскіх прадпрыемстваў.

Зьезд заслухаў садаклад упаўнаважанага Трактара цэнтру—тав. Камаева.

Машына-трактарная станцыя,—гаворыць тав. Камаеў,—ня толькі выканаўца тэхнічнае працы, а організатар колгаснага прыліву, агітатар за колгас. Аднак працаўнікі колгасаў яшчэ і зараз недаацэньваюць яе ролі. Характэрна, што рэалізацыя акцый Трактарацэнтру праводзіцца недапушчальна марудна. Пры наяўнасьці раёнаў, якія выканалі заданьне на 75 проц., ёсьць раёны, якія далі толькі 0,7 проц.

Нездавальняюча праводзіцца і складаньне дагавароў. Умовы складаюцца з тымі колгасамі, якія ўжо існуюць і зусім не зьвяртаецца ўвага на тое, каб скласьці ўмову з аднаасобнікамі на колектыўную апрацоўку зямлі і на падставе гэтага ствараць новыя колгасы. Дакладчык гаварыў яшчэ аб рамонце трактароў, аб доглядзе за машынамі.

Зьезд заслухаў садаклад тав. Гуткіна аб колгасных кадрах.

У спрэчках па дакладу Колгасцэнтру выказаліся Шэвелеў—Бабруйскі раён. Арлоў—Мэнжынскі, Шыманская—Боркавіцкі, Аўсеенка—Камарынскі, Федарэнка—Полацкі, прадстаўнік з чырвонаармейскай сельска-гаспадарчай комуны.

Проста і пераканаўча гаворыць колгасьніца Журбіна з колгасу „Шлях соцыялізму" (Гомельскі раён).

—Партыя,—кажа яна,—вядзе нас па правільным шляху. Вось я, працую ў колгасе з сынам падлеткам, атрымала даходу 500 пудоў бульбы, жыта, проса, адзеньне. Ці-ж зарабіла-б я гэта, працуючы асобна?—пытаецца яна ў аўдыторыі і сама адказвае:—Не, ніколі.


Калі хто яшчэ не пераканаўся ў перавазе колгасаў над аднаасобнай гаспадаркай, пагутарце з колгасьніцай Журбінай. Яна няпісьменная, азнаёміць вас з усёю арытмэтыкай колгаснага жыцьця, з арытмэтыкай колгасных перамог.

Тав. Федарэнка—старшыня чырвонаармейскай комуны—гаворыць аб сваёй працы.

Комуна была організавана з 12 сем'яў дэмобілізаваных чырвонаармейцаў. А зараз ужо 66 сем'яў з 360 едакоў. Наша комуна лічыцца першай па выкананьні ўрадавых заданьняў. Комуна першая выканала заданьне па хлебазагатоўках.

Тав. Федарэнка спыніўся на пытаньні вэтэрынарнага абслугоўваньня жывёлагадоўчых фэрм комуны. Ён адзначыў, што гэтая праца пастаўлена нездавальняюча, прыводзіў факты недапушчальных адносін вэтэрынарных фэльчароў да выкананьня сваіх абавязкаў.

Дэлегат зьезду



Тав. Салдаценка—брыгадзір Зах. вобласьці

Дэлегатка зьезду



Тав. Ярмаліцкая (колгас „Прогрэс" Слуцкага р-ну)

Супроць опортуністычнай недаацэнкі мопраўскай работы

Ад другога да трэцяга зьезду МОПР, комсамольскі асяродак МОПР'у павялічыўся па Беларусі на 40 проц. было комсамольцаў—мопраўцаў 474 тысячы, а цяпер—667 тысяч, што складае 25 проц. агульнай колькасьці комсамолу, тады як V кангрэс КІМ'у паставіў перад комсамолам задачу стопрацэнтнага ўцягненьня комсамольцаў у рады МОПР'у.

Акрамя гэтага, комсамол слаба ўдзяляе ўвагі мопраўскай рабоце. Частка організацый недаацэньвае і зьнявагліва адносіцца да яе.

У Гомелі, напрыклад, у шмат якіх ячэйках нават з боку актыву наглядаюцца самыя безадказныя, недапушчальныя адносіны да справы папулярызацыі работы ячэек МОПР'у.

— Ды, што вы суецеся з добраахвотнымі таварыствамі, што вы суецеся з Мопрам? У нас ёсьць справы паважней. Мы ліквідуем прарыў нехай нам Мопрам займацца.

Праваопортуністычныя, пагардлівыя і абыякавыя адносіны многіх з кіраўнікоў да працы МОПР'у і інтэрнацыянальнага выхаваньня.

Яны прывыклі адносіцца да самых сур'ёзных і штодзённых справаў на-кампанійску, а таму і працуюць яны наскокам, выпадкова.

Не вядуць ніякай працы з новымі членамі МОПР'у, якія натуральна становяцца „мёртвымі душамі", а потым няпрыкметна для сябе, не плацяць узносаў, губляюць білеты... ячэйка разваліваецца. Такія факты маюцца і ў Менску, і ў Гомелі, і ў Віцебску.

У гомельскім ФЗВ імя Дзяржынскага нескалькі раз організоўвалася і разваліваецца Мопраўская ячэйка. Калі „падкруціць" справу, тады замітусяцца, правядуць сход, пагорнуць растлумачальную працу, маса ўступае ў МОПР, але... хутка астываюць, забываюць пра справы і адказ за мопраўскую ячэйку. Толькі зьдзіўлена разводзяць рукамі.

Шмат якія комсамольскія ячэйкі, а таксама агітпропы комсамолу—Трамы не павярнуліся яшчэ, як належыць, тварам да МОПР'у, да ўмацаваньня пасылак у справе інтэрнацыянальнага выхаваньня. А між тым т. Хітараў яскрава адзначыў, што „работа МОПР'у зьяўляецца адным з важнейшых рычагоў інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўных мас, у тым ліку і працоўнай моладзі. Кожны комсамолец павінен на справе быць актыўным мопраўцам".

Трэба памятаць, што мопраўцы павінны быць надзейнымі памочнікамі партыі, з усёй энэргіяй змагацца за ўмацаваньне СССР, за шчыльную сувязь з працоўнымі ўсяго сьвету, за ўмацаваньне выхаваўчай інтэрнацыянальна-палітычнай працы, за дапамогу пролетарыяту капіталістычных краін.

Цішка Верны.

Вучэцеся перамагаць клясавага ворага ў адкрытых сутычках на франтох будучай грамадзянскай вайны

Аўладаньне ваеннай тэхнікай, ваеннымі ведамі да гэтага часу яшчэ ня стала абавязкам кожнага комсамольца.

Праз маршруты баявой падрыхтоўкі мы ставілі конкрэтную задачу—каб кожны комсамолец меў мінімум ваенных ведаў, добра вывучыў строй, ведаў армію і яе пабудову.

Аднак, весткі з месц паказваюць, што рад організацый усё-ж недаацаніў значэньня ваеннай вучобы. Работа па аўладаньню ваеннай тэхнікай ня ўсюды пастаўлена на належную вышыню.

Неабходна ўцяміць, што „будучая бойка—бойка клясавая. Пакуль застаўся час, кожны комсамолец, кожны малады рабочы, кожны малады селянін трэніруйся, вучыся, як перамагаць клясавага ворага ў адкрытых сутычках на франтох будучай грамадзянскай бойкі. Той, хто гэтага не разумее, той сам сабе вораг". (Косараў).



За вывучэньнем вайскова справы

ЛОЕУЦЫ Ў АПОРТУНІСТЫЧНЫМ БАЛОЦЕ

Комсамольская організацыя Лоеўскага раёну ня цікавіцца ваеннай справай. Комсамольцы не наведваюць ваенных гурткоў. Да рэчы сказаць, гурткі ня маюць сталых кіраўнікоў і неабходнай літаратуры, па якой можна было-б павышаць свой узровень ваенных ведаў.

Ня так даўно кіраўніком ваеннай падрыхтоўкі быў вылучаны тав. Пераплётчыкаў. Ён добра ведае ваенную справу. Але яго пачалі пасылаць у розныя разьезды, даваць розныя нагрузкі. У выніку тав. Пераплётчыкаў ня змог кіраваць ваеннай падрыхтоўкай.

Райком комсамолу павінен тэрмінова зьвярнуць увагу на дрэнны стан ваенізацыі комсамольцаў, вылучыць адпаведнага кіраўніка, які-б паставіў на належную вышыню вайсковую работу сярод моладзі.

Каранеўскі.

Падрыхтоўку ваенных кіраўнікоў сарвалі

Ня так даўно ў Клічаве, па пастанове райкому комсамолу, адчыніліся месячныя ваенныя курсы. На гэтыя курсы ўсе ячэйкі павінны былі прысылаць сваіх прадстаўнікоў. Курсы разьлічаны на падрыхтоўку ваенных кіраўнікоў для комсамольскіх ячэек, у якіх зараз адчуваецца вялізарная патрэба.

Ня гледзячы на гэта, несятоўская ячэйка ня сур'ёзна аднеслася да выдзяленьня на курсы сваіх прадстаўнікоў. Праўда, былі вылучаны два таварышы, але яны адмовіліся. Да іх ячэйка ня прыняла ніякіх мер і другіх ня вылучыла. У выніку ячэйка засталася без ваенных кіраўнікоў. Райком на гэта таксама не зьвярнуў належнай увагі.

Якуб Караленка

„Што нам небясьпека!?"

Ня гледзячы на небясьпеку вайны, якая пагражае з боку капіталістых, комсамольскія організацыі Сьвіслацкога раёну не клапоцяцца аб тым, каб падрыхтаваць з сваіх радоў чырвоных барацьбітоў. Ні адна ячэйка ня мае ваеннага гуртка, ваенная работа яшчэ не разгорнута.

Комсамолія раёну нават ня ведае пра шэфства комсамолу над паветранымі і морскімі сіламі РСЧА.

Лепшыя комсамольцы не камандыруюцца ў ваенна-морскія школы.

Раённы Камітэт комсамолу павінен ужыць захады і безадкладна разгарнуць работу па ваенізацыі моладзі.

Завіруха.

Прэзыдыум ЦВК СССР адхіліў хадайніцтва падсудных па працэсу „союзнага бюро" аб зьмякчэньні прысуду

МАСКВА.—Адразу-ж пасьля таго, як скончыўся працэс „союзнага бюро" РСДРП (меншавікоў) усе падсудныя падалі хадайніцтва Прэзыдыуму 6-га зьезду саветаў СССР аб зьмякчэньні прысуду. Прэзыдыум зьезду даручыў разгляд хадайніцтва Прэзыдыуму УсеЦВК СССР, разгледзеўшы хадайніцтва Громана, Шэра, Ікава і інш. асуджаных па справе „союзнага бюро" РСДРП (меншавікоў), Прэзыдыум УсеЦВК пастанавіў хадайніцтва адхіліць.

За тэхніку! За якасьць!

„Ад гэтага часу комсамолец і ўдарнік правяраюцца тым, наколькі ён пасапраўднаму пачынае валодаць плянам, рацыяналізацыяй, наколькі ён робіцца спэцыялістым, сапраўдным гаспадаром справы, знаўцай свайго варштата, цэху, прадпрыемства“ (з пастановы ЦК УсеЛКСМ)

(З ДАКЛАДУ ТАВ. ЮРК'ЯНЦА НА II ПЛЕНУМЕ ЦК ЛКСМБ)

Лічбы перамог

ытаньне „хто каго“ зараз ужо рашана ў прамысловасьці. Вырашецца яно і ў сельскай гаспадарцы зумоўна ў бок соцыялізму. На сёньі ў выкананьні прамфінпляну і рэнструкцыі сельскай гаспадаркі мы ем шэраг якасных посьпехаў. За гады пяцігодкі прамфінплян па Беусі выкананы звыш наметак на 2 проц. У рэконструкцыі сельскай спадаркі мы маем цэлы шэраг посьхаў. Так, напр., у пачатку 1930 г. ССР была колектывізавана толькі 4 проц., да кастрычніка 1930 г.— 12 проц., і на 1 сакавіка 1931 г. о 18 проц. бядняцка-серадняцкіх спадарак знаходзяцца ў колгасах.

Гэтых посьпехаў мы дабіліся дзяючы таму, што няўхільна праводзім эральную лінію нашай партыі, змаемся з правым ухілам, як галоўнай бясьпекай на даным этапе, з рэштмі контррэволюцыйнага троцкізму, дзем пасьлядоўнае соцыялістычнае ступленьне па ўсім фронце, ліквім кулацтва як клясу на базе суьнай колектывізацыі.

3-ці рашаючы год пяцігодкі ставіць рад намі вялікія задачы. Прамыслоі продукцыя павінна ўзрасьці на проц., у асноўным павінна быць лектывізавана 50 проц. бядняцкаэрадняцкіх гаспадарак. У 3-м рашаюм годзе пяцігодкі мы павінны завяршыць пабудову фундаманту соцыялістычнай экономікі.

Каб пасьпяхова выканаць пляны рашаючага году, нам неабходна ўзьняць соцспаборніцтва і ўдарніцтва на вышэйшую ступень. Гэта значыць, павесьці рашучую барацьбу за тэхніку, масавую рацыяналізацыю, вынаходзтва, максымальнае скарыстаньне ўнутраных рэсурсаў, ушчыльненьне тэхнічнага абсталяваньня і г. д. Тут мы сустракаемся з нашай тэхнічнай няпісьменнасьцю. Гэта тэхнічная няпісьменнасьць перашкаджае нам аўладаць усімі вучасткамі нашай працы. Адсюль у нас і шэраг недахопаў у выкананьні прамфінпляну. Узяць, напр., першыя два месяцы. Яны паказваюць, што па ўсіх галінах прамысловасьці Беларусі прамфінплян ня выконваецца. Некаторыя ячэйкі і гаспадаркі спасылаюцца на об'ектыўнасьць, на тое, што няма сыравіны і г. д. Трэба сказаць, што большасьць нашых заводаў і фабрык маюць даволі сыравіны, а таксама і ўсе магчымасьці выканаць прамфінплян. Але галоўнае зло—наша тэхнічная няпісьменнасьць.

У зьвязку з гэтым, мы павінны паставіць перад сабой задачу: мобілізаваць комсамольскія організацыі і ўсю беспартыйную працоўную моладзь на аўладаньне навукай і тэхнікай, аб чым гаварыў на нарадзе гаспадарнікаў тав. Сталін.

Програма баявых дзеяньняў

Пленуму ЦК неабходна выказацца тое, каб уся комсамольская оргаацыя Беларусі ўключылася ў паход аўладаньня тэхнікай і навукай, гэта бясьпечыць усе вучасткі нашага буўніцтва актыўнейшым удзелам коммолу ў выкананьні ўсіх кантрольных баў пяцігадовага пляну народнае спадаркі.

Якія асноўныя задачы павінны мы ставіць перад комсамольскай оргаацыяй, у зьвязку з правядзеньнем ходу за аўладаньне навукай і тэхкай?

Па-першае, мы павінны накіраць увагу ўсёй комсамольскай оргаацыі на ліквідацыю тэхнічнай няісьменнасьці, на барацьбу за кольснае і якаснае выкананьне прамнпляну, за мэханізацыю, рацыяналідыю вытворчасьці ва ўсіх галінах спадаркі, супроць няправільнага арыстаньня апалу, сыравіны і рабое сілы. Нам неабходна сконцэнтраць увагу на выкананьне задач па білізацыі ўнутраных рэсурсаў, поўю нагрузку абсталяваньня. Накіраць творчую ініцыятыву рабочых мас па такім рэчышчы, якое-б забясьпечыла выкананьне ўсіх задач, пастаўленых партыяй перад намі.

У паходзе комсамолу за аўладаньне навукай і тэхнікай, неабходна ператварыць соц. спаборніцтва і ўдарніцтва на вышэйшую ступень. Плянаваопорацыйныя групы, рацыяналізатарскія брыгады, організацыя соцыялістычных скразных конвэераў якасьці—павінны стаць здабыткам кожнай організацыі.

Мы ведаем, што на нашых фабрыках і заводах ёсьць рад каштоўных вынаходзтваў і рабочых прапаноў, але яны залежваюцца з прычыны нашай тэхнічнай няпісьменнасьці і непаваротнасьці гаспадарнікаў. У паходзе мы павінны іх рэалізаваць. У больш шырокай форме трэба практыкаваць шэфства комсамольскіх ячэек над рабочымі прапановамі і над паасобнымі вынаходцамі.

Важнейшая задача комсамолу—максімальна пашырыць сетку школ ФЗВ, ФЗС, школ рабочага юнацтва, заводаў-втузаў, каб забясьпечыць нашу прамысловасьць і сельскую гаспадарку тэхнічна-адукаванымі кадрамі.

Радыё, кіно, друк—на службу аўладаньня тэхнікай

Побач з ліквідацыяй сваёй тэхнічй няпісьменнасьці, неабходна прасьці шырокую прапаганду таксама сярод шырокіх мас працоўнага насельніцтва за ліквідацыю і аўладаньне хнікай. Для гэтага мы павінны скастаць усе формы і мэтоды пропаанды. Лекцыі, даклады, кіно, друк, аратура, радыё—усё гэта трэба ставіць на службу мас для аўлаьня тэхнікай.

Трэба вызначыць адзін дзень у пяцідзёнку, як „дзень навукі і тэхнікі“, задачай якога павінна зьявіцца абавязковае вывучэньне мінімуму тэхнічных ведаў.

Менскі гарком ЛКСМБ вынес пастанову аб рэорганізацыі Дому Комсамола ў „Дом навукі і тэхнікі“. Трэба, каб гэтая пастанова была хутчэй выканана, каб гэты Дом навукі і тэхнікі зьявіўся цэнтрам мэтодычна-консультацыйнай базы па распаўсюджваньню вопыту тэхнічнай прапаганды. Да гэтага Дому неабходна прыцягнуць спэцыялістых. Такія Дамы павінны быць організаваны і ў буйных гарадох БССР (Віцебск, Гомель, Ворша, Барысаў і Магілеў).


Ва ўмовах БССР аўладаньне навукай і тэхнікай шырокімі коламі працоўнага насельніцтва павінна быць падпарадкавана задачам, пастаўленых партыяй у соцыялістычным разьвіцьці тых галін гаспадаркі, якія зьяўляюцца вядучымі, якія ператвараюць БССР з краіны спажывецкай у краіну высокапродукцыйную. Адсюль неабходна забясьпечыць глыбокае вывучэньне тэхнікі па вядучых галінах народнай гаспадаркі; мэталюргіі, машынна-будаўніцтва і г. д.

Аб'ява аб занятках тэхгуртка.

У бой—за тарпяны Донбас

Наша Беларусь з балот павінна ператварыцца ў тарпяны Донбас. А мы да сучаснага моманту ў пытаньнях рэалізацыі ўзятых на сябе абавязкаў па шэфству над электрычнасьцю і торфам у большай частцы палец аб палец ня ўдарылі, ня гледзячы на тое, што гэтая галіна работы зьяўляецца вядучай ў БССР.


Неабходна аўладаць усімі ўласьцівасьцямі чыгуначнага, воднага і да-



Тав. Юрк'янец

рожнага будаўніцтва, сродкамі сувязі —тэлефонам, тэлеграфам. Гэта нам неабходна для ўмацаваньня баяздольнасьці нашай краіны.

Зараз трэба сконцэнтраваць увагу на аўладаньні тэхнікай у пытаньнях будаўніцтва, вывучыць увесь процэс дрэваапрацоўчай прамысловасьці па-



За вывучэньнем аўтаматычнай сцэпкі.

чынаючы ад сыравіны і канчаючы тэхнічнай апрацоўкай.

Неабходна вылучыць і аўладаць усімі ўласьцівасьцямі хэмічнай прамысловасьці, накіраваўшы яе на разьвіцьцё і ўзьняцьцё ўдзельнай вагі соцыялістычнай прамысловасьці і абароназдольнасьці нашай краіны.

Такія задачы павінны стаць у нас паходу комсамолу за аўладаньне навукай і тэхнікай перад гарадзкім комсамолам.

Ленінскаму вясковаму комсамолу патрэбна аўладаць тэхнічнымі ўласьцівасьцямі трактару, плянаваньнем, рацыяналізацыяй, організацыяй тэхнікі працы, на падставе вывучэньня марксысцка-ленінскага аналізу экономікі і структуры, організацыі буйных гаспадарак соцыялістычнага тыпу, разгортваньня соц. спаборніцтва і ўдарніцтва.

Вывучэньне тэхнікі сельскай гаспадаркі павінна прайсьці па лініі спэцыялізацыі нашых раёнаў у яе вядучых галінах. Аўладаць агротэхнічным і зоотэхнічным мінімумам ведаў—вось у чым гвозд.

Выкананьне пастаўленых перад намі задач у адносінах аўладаньня навукай і тэхнікай шмат залежыць ад таго, на колькі наша комсамольская організацыя зможа прыцягнуць да гэтай справы навуковыя сілы—спэцыялістых, інжынэраў і тэхнікаў.

Таму мы павінны шырока скарыстаць навуковых працаўнікоў, іх вопыт, злучыўшы яго з энэргіяй, ініцыятывай і энтузіязмам працоўных мас.

Адным з рашучых вагароў укараненьня тэхнікі ў шырокія колы працоўных зьяўляюцца таварыствы „Тэхніка—масам“. Аднак, у нас яшчэ зусім малая колькасьць ячэек скарыстала іх у гэтым напрамку. Таварыствы ўсё яшчэ ня масавыя організацыі. Іх трэба перабудаваць у адпаведнасьці з усім рухам, кожны комсамолец павінен быць удзельнікам гэтага таварыства.

Вялікую ролю ў пытаньнях прапаганды тэхнікі павінен адыграць наш друк. Неабходна падтрымаць ініцыятыву „Чырвонай Зьмены“ аб выданьні спэцыяльнай тэхнічнай старонкі, якая-б давала штодзённую мэтодычную консультацыю і зьявілася-б скарбонкай комсамольскага вопыту.



Гэтая ініцыятыва павінна быць перанесена ва ўсе газэты.

Ня меншую ролю ў прапагандзе тэхнікі адыгрывае радыё. Наладжваньне сэрыі дакладаў, лекцый, мэтодычных парад, організацыі радыё-пераклічак дапаможа ўкараніць тэхніку ў працоўныя масы.

Складзьці пяцігодку тэхнічнай прапаганды

Ці ёсьць у нас у выстарчальнай колькасьці неабходная тэхнічная літаратура? Не яе ў нас зусім мала. Адпаведныя організацыі павінны безадкладна заняцца выпускам у сьвет популярнай тэхнічнай літаратуры.

На службу тэхніцы павінна прыйсьці і кіно.

ЛКСМБ, пасьля закліку Сталіна і рашэньняў ЦК УсеЛКСМ, зрабіў ужо першыя крокі па аўладаньню тэхнікай. Організацыя вечароў тэхнікі на заводзе „Энэргія“, „Комбінат“ (Барысаў), у паасобных ячэйках Віцебску і Гомеля, складаньне соц. умоў з ІТС, організацыя гурткоў і г. д.—гэта першыя пачаткі вялікага паходу.

У паход за навуку і тэхніку трэба ўключыць піонэрорганізацыю, забясьпечыўшы яе актыўны ўдзел, яе прапаганду сярод шырокіх колаў працоўнага насельніцтва, увязаўшы гэта з політэхнізацыяй школ. ЦБ ДКО павінна распрацаваць шэраг мерапрыемстваў, якія забясьпечылі-б актыўны ўдзел піонэрорганізацыі ў паходзе за аўладаньне навукай і тэхнікай.

Комсамол павінен паставіць пытаньне перад урадам аб правядзеньні хутчэйшай ліквідацыі тэхнічнай няпісьменнасьці сярод усіх працоўных у абавязковым парадку.

Трэба перад адпаведнымі організацыямі паставіць пытаньне аб распрацоўцы пяцігадовага пляну тэхнічнай прапаганды. Гэты плян павінен быць уключан у плян культурнай пяцігодкі.

Пытаньне аўладаньня навукай і тэхнікай павінна стаць стрыжнем работы комсамольскіх ячэек. Усе гаспадарча-політычныя мерапрыемствы павінны быць шчыльна ўвязаны з пытаньнямі аўладаньня тэхнікай.

У гэтых адносінах работа ячэйкі і РК ЛКСМБ павінна ацэньвацца па тым, наколькі яны зрабілі паварот тварам да тэхнікі, наколькі яны зьявіліся ініцыятарамі шэрагу масава-опэрацыйных мерапрыемстваў па ўнядрэньню тэхнікі ў працоўныя масы.

Кожны комсамолец, кожны ўдарнік павінен ведаць свой варштат, сваю фабрыку, свой цэх, свой колгас і саўгас.

Трэба, каб кожны комсамолец ведаў працэсы вытворчасьці ў вядучых галінах прамысловасьці і сельскае гаспадаркі.

Трэба памятаць, што той, „хто дае высокія тэмпы плюс якасьць, той і лепшы баец у клясавай барацьбе, той лепшы баец у барацьбе за соцыялізм“ (Косараў).


Толькі пры такіх умовах мы зможам выканаць пяцігодку за 4 гады, а ў асноўных галінах нашага будаўніцтва —у тры гады.

Неабходна павесьці рашучую барацьбу з усімі тымі, хто недаацэньвае пытаньне аўладаньня навукай і тэхнікай. Клясавы вораг імкнецца і будзе імкнуцца ўсімі сродкамі перашкаджаць нам у гэтых адносінах. Трэба даваць рашучы бой прыпынаючым настроям, самацёку ў гэтым пытаньні, гэтыя настроі мы павінны выкарчоўваць з корэньнем.

На заклік тав. Сталіна, на заклік ЦК УсеЛКСМ трэба адказаць уключэньнем ЛКСМБ у гэты вялікі паход.

Справа барацьбы за аўладаньне тэхнікай павінна стаць барацьбой за выкананьне пяцігодкі, за соцыялізм.

„Тэхніка ў рэконструкцыйны пэрыод вырашае ўсе“ (Сталін). Калі мы бальшэвіцкім аўладаньнем навукай і тэхнікай шырокімі працоўнымі масамі, тады мы з посьпехам выканаем усе задачы, якія пастаўлены перад намі партыяй (воплескі).



Тэхнічны агляд комсамольцамі паравозу № 685-05.

Першае паседжаньне прэзыдыуму ЦВК СССР новага складу

МАСКВА,—21-га сакавіка пад старшынстваньнем тав. Калініна адбылося першае паседжаньне прэзыдыуму УсеЦВК СССР новага складу. Прэзыдыум УсеЦВК ССР зацьвердзіў сакратарыят у складзе т. Калініна, Енукідзэ, Мядзьведзева, Таджыцева, Кісялёва і Чуткаёва.

Тав. Калінін зацьверджан старшынёю камітэту садзейнічаньня будаўніцтву буйных збожжавых саўгасаў і камітэту садзейнічаньня будаўніцтву жылёлагадоўчых саўгасаў. Тав. Енукідзэ зацьверджан старшынёю цэнтральнай выбарчай камісіі. Склад застаецца ранейшы. Тав. Мядзьведзеў абраны старшынёю камісіі па палепшаньню працы і быту жанчын. Тав Луначарскі зацьверджан старшынёю камітэту па загадваньню вучонымі і навучальнымі ўстановамі. УсеЦВК СССР.

Абвінаваўчае заключэньне па справе Палянскага--пакрыцьцё польскімі кіруючымі коламі падпальшчыкаў вайны супроць СССР

АНТЫСАВЕЦКАЯ МАНІФЭСТАЦЫЯ

Як паведамляюць польскія газэты, 9 красавіка ў варшаўскім акруговым судзе павінен адбыцца процэс Палянскага—аднаго з арганізатараў замаху на ўзрыў савецкага паўпрэдзтва ў Варшаве, у красавіку мінулага году.

Тэрор супроць савецкіх прадстаўнікоў у Польшчы пачаўся іменна ў той момант, калі, у сувязі з прыходам да ўлады кіруючага зараз лягеру пілсудчыкаў, рэзка ўзмацнілася антысавецкая ўстаноўка замежнай палітыкі Польшчы. Актывізацыя варожых СССР колаў у Польшчы, нясупынныя антысавецкія кампаніі ў друку, якія спадарожнічаюць агідным цкаваньнем савецкага дыплёматычнага прадстаўніцтва, стварылі тую насычаную антысавецкім шаленствам палітычную абстаноўку, якая развязвала рукі Каверды і Вайцахоўскаму, арганізатарам замаху на ўзрыў паўпрэдзтва і тым, якія сталі за іх сьпіною. Тая акалічнасьць, што тэрорыстычныя акты ў Польшчы выкарыстоўваюцца зараз кіруючымі коламі для новых антысавецкіх выпадаў, зьяўляецца відочным і пераканаўчым пацьверджаньнем салідарнасьці гэтых колаў з тымі цёмнымі сіламі, якія здольны імкнуцца парушыць мір.

Абвінаваўчае заключэньне па справе Палянскага праліваае яркі сьвет на тую провокацыйную гульню, якую польская ўлада зацяла вакол гэтай справы.

Сьледчы матар'ял згрупаван—такім чынам, каб падкрэсьліць перш за ўсё, як гэта было і раней, „індывідуальны" характар замаху, ня гледзячы на тое, што само абвінаваўчае заключэньне прыводзіць кідаючыяся ў вочы даныя, што Палянскі дзейнічаў у складзе організацыі.

Падсудны будзе паказан як „ідэйны комуністы", „які супрацоўнічае ў мінулым з савецкаю ўладай" і „карыстаецца ўе падтрыманьнем" „расчараваны" потым у комунізьме і пошыраць на нейкія там „крыўды" На вопыту процэсаў Каверды і Вайцахоўскага можна згаданей сьцьвярджаць, што і пракурор і абарона скарыстаюць усё сваё красамоўства для, таго, каб суд над вінавайцай тэрорыстычнага замаху перанесьці ў плошчу паказу замаху як „барацьбы ў лягеры комуністых" адцягваючы тым самым увагу ад тэй абстаноўкі ў Польшчы, за ўмавах якое могуць, пры патураньне польскае ўлады, утварацца тэрорыстычныя замахі на савецкіх дыплёматычных прадстаўнікоў. Ёсьць ўсе падставы чакаць, што суд над Палянскім будзе ператворан уплывовымі коламі ў Польшчы ў вялікую антысавецкую дэмонстрацыю.

Рабочая кляса і працоўныя масы СССР успрымуць гэтую антысавецкую маніфэстацыю, як праяву солідарнасьці польскіх урадавых колаў з тымі сіламі, якія ўзмоцнена працуюць над уцягненьнем Польшчы ў новую антысавецкую вайну.

(З „Праўды" па радыё)

Чарговая провокацыя фашызму супроць Савецкага Саюзу

ВАРШАВА,—У польскай прэсе апублікавана абвінаваўчае заключэньне па справе Палянскага аб замаху ў красавіку 1930 году на ўзрыў памяшканьня савецкага паўпрэдзтва ў Варшаве.

Абвінаваўчае заключэньне прадстаўляе гэту справу ў выглядзе індывідуальнага акту самага Палянскага, які самымі прымітыўнымі сродкамі зрабіў пякельную машыну і сам усыпіў яе ў комін памяшканьня паўпрэдзтва. Справа будзе разглядацца ў акруговым судзе.

У першай частцы абвінаваўчага акту апісваецца як была выкрыта пякельная машына ў коміне паўпрэдзтва СССР у Варшаве.

Далей падрабязна раскавваецца аб праведзеным польскай уладай сьледзтве, у Варшаве і Горадні, дзе жыў Палянскі да свайго прыезду ў Варшаву. Абвінаваўчы акт устанаўляе абліччча Палянскага на аснове паказаньняў яго жонкі і знаёмых. Гэтыя паказаньні характарызуюць „Палянскага як ворага бальшавізму", які Палянскі разглядаў як праяву „імкненьня яўрэяў да захвату ўлады надрыхьсціянскім сьветам". У размовах Палянскі заяўляў, што лічыць Расію сваёй бацькаўшчынай і выказваў жаль, што няма такой арганізацыі, якая-б паставіла сваёй мэтай барацьбу з рускім комунізмам шляхам замахаў на савецкіх прадстаўнікоў у розных дзяржавах, каб справакаваць такім чынам вайну і зьнішчыць комунізм.

З абвінаваўчага заключэньня вынікае, што варожыя адносіны Палянскага да савецкай улады пачаліся ў 1924 годзе. Да гэтага часу, ён нібы быў „прыхільнікам комунізму" і нават супрацоўнічаў з савецкаю ўладай маючы ад яе падтрыманьне. Палянскі заявіў, што быццам зрабіў замах асабіста і ён ніякіх супольнікаў не меў.

Паводле цьверджаньняў абвінавачанага, ён пасьля сусьветнай вайны нібы быў „ідэйным комуністам" і за „комуністычную дзейнасьць" быў высланы з межаў Аўстрыі, Вэнгрыі, Юга-Славіі і Румыніі. У 1923 годзе Палянскі прыбыў у Вену і, ня маючы там права на прабываньне, нібы паступіў на работу ў паўпрэдзтва СССР, у якім працаваў на працягу 3-х месяцаў, займаючы розныя пасады ў адміністрацыйным і гаспадарчым аддзелах паўпрэдзтва, аддзеле друку, і, нарэшце, у якасьці ваеннага аташэ.

У лістападзе 1923 году Палянскі па асабістаму жаданьню нібы быў высланы разам з жонкай праз Стоўбцы ў Расію. 2-га сьнежня 1923 году Палянскі, паводле яго паказаньняў, прыбыў у Маскву, дзе ён, „як вядомы комуністы быў накіраваны ў распараджэньне ЦК РКП". Расчараваўшыся ў 1924 г. у комунізьме, Палянскі, паводле яго цьверджаньняў, захацеў прапагандаваць у масах ідэю барацьбы з комунізмам, ахвяраў якога ён стаў і, лічачы прадстаўніцтвы СССР „рассаднікамі комунізму", парашыў свой тэрорыстычны акт накіраваць супроць іх.

Сьледчаму Палянскі заявіў, што ён вінаватым сябе не прызнае, але прызнае факт організацыі ім замаху на савецкае паўпрэдзтва. (ТАСС).

Паслуга інтэрвэнтам

ВЕНА, 21. Соцыял-фашысцкая газэта друкуе пастанову ЦК соц. дэм. партыі, па якой члены партыі не павінны ўступаць у „Саюз Прыхільнікаў СССР". Пастанова матывуецца тым, што „Саюз Прыхільнікаў СССР" быццам „зьяўляецца комуністычнай ячэйкай унутры соц-Дэмократычнай партыі". Комуністычная „Ротэ Фанэ" піша, што гэта рашэньне соц. фашысцкіх лідэраў—„непасрэдны, абдуманы удар па абарончаму фронту савецкага саюзу і далікатная паслуга інтэрвэнтам".

„Сучасная позыцыя Злучаных Штатаў у адносінах СССР уяўляе сабою пагрозу ўсеагульнаму міру"

ВАШЫНГТОН, 20.-„Нацыянальны савет папярэджаньня вайны" (Уплывовая буржуазна-пацыфісцкая організацыя ПАЗШ) апублікавала дэклярацыю пад загалоўкам „наша позыцыя ў адносінах да Савецкага Саюзу ўяўляе сабою пагрозу ўсеагульнаму міру".

Дэклярацыя пачынаецца з пытаньня: „ці жадаюць распальнікі вайны справакаваць новую вайну, на гэты раз Савецкім Саюзам?" Напамінаючы аб розных прадлогах, выкарыстаных для кампаніі супроць СССР, а таксама аб прапагандзе камісіі Фіша, дэклярацыя заяўляе: „за апошні час мы з растучай трывогай сачылі за запаўзяючай старонкі сусьветнага друку анты-савецкай прапагандай, што носіць міжнародны характар і мае міжнароднае кіраўніцтва".

Дэклярацыя падкрэсьлівае, што сучасная позыцыя Злучаных Штатаў у адносінах СССР уяўляе сабою пагрозу ўсеагульнаму міру і выказвае надзею, што марнуеме міністэрствам замежных спраў Злучаных Штатаў вывучэньне савецкага пытаньня „прывядзе да рашэньня, якое загоіць гэтую гнаючую рану і дапаможа стабілізацыі міжнародных адносін".

„Злучаныя Штаты,—гаворыцца далей у дэклярацыі,— павінны ўзяць у свае рукі ініцыятыву вырашэньня конфлікту з Савецкім Саюзам".

Манэўр рэформістых

ЛЁНДАН, 21.—З тае прычыны, што гарнякі настойліва патрабуюць абвясьціць забастоўку, Паўднёва-Уэльская конфэдарацыя горнарабочых прышла к новаму манэўру і склікала раней тэрміну адкладзеную да 28 сакавіка дэлегацкую конфэрэнцыю. Такім чынам, правядзеньне мясцовых конфэрэнцый сарвана рэформістамі з баязьні, што дэлегатам будуць дадзены інструкцыі галасаваць за безадкладнае абвяшчэньне забастоўкі. Ужо зусім відочна, што большасьць гарнякоў патрабуюць абвясьціць забастоўку Цэнтральны забастовачны камітэт заклікае гарняў адкрыць забастоўку пад рэволюцыйным кіраўніцтвам.

Чаму зачынена „Харбін Геральд"

ТОКІЁ, 20.—Як паведамляюць з Харбіну, там урадам зачынена выдаваемая кітайскім падданым Сімптон на ангельскай і рускай мовах газэта „Харбін Геральд".

Гэта была адзіная газэта, якая об'ектыўна асьвятляла становішча ў СССР. Яна карысталася популярнасьцю ў колах чыгуначнікаў і савецкай колёніі, не маючай да гэтага часу сваіх газэт і пазбаўленых магчымасьці атрымліваць газэты з СССР. Зачыненьне газэты, безумоўна, вынік той жорсткай кампаніі, якую ў апошні час мясцовая белагвардзейская эміграцыя вяла супроць газэты.

У сучасны момант у Харбіне засталося 5 газэт, выходзячых на расійскай мове. Усе яны—белагвардзейскія.

З прад'юбілейнай

АБВЯСЬЦІЦЬ МЕСЯЧНІК ЗА ТЫРАЖ „ЧЫРВОНКІ"

Газэта павінна быць кіруючым настольны[…] нікам у працы кожнага комсамольца, комсамольскай ячэйцы

Месячнік за 60.000

„Чырвонка" ня толькі на сваіх старонках адбівае наша жыцьцё і змаганьне, а зьяўляецца барацьбітом за соцыялістычную перабудову нашай народнай гаспадаркі.

Рост масы юнкораў, абгаварэньне зьмешчаных допісаў, рост тыражу—вось конкрэтныя факты, якія гавораць за ўзрост аўтарытэту „Чырвонай Зьмены" ў шырокіх колах рабочай, бядняцка-серадняцкай моладзі.

Можна прывесьці цэлы рад прыкладаў зацікаўленасьці моладзі ўзьнятымі ў „Чырвонай Зьмене" пытаньнямі. Узяць хаця-б ліст юнкора-будаўніка, які абгаварваўся на агульных сходах комсамольскіх ячэек, нарадах юнкораў.

„Чырвоная Зьмена" змагалася з правымі выступленьнямі ў комсамоле з адхіленьнямі ад гэнэральнай лініі партыі зьмяшча[…] старонках факты ко[…] аў.

Барацьба „Чырвон[…] ФЗВ мае ўжо пэўны[…]

Зараз „Чырвоная […] мае кампанію вытвор[…] на будаўніцтве. Гэта […] свой водгук. Па дву[…] будвучу абвешчаны […] нэўры.

Вітаючы пастанову[…] давядзеньні тыражу „[…] ны" да 60.000 экз., […] вясьціць месячнік „Ч[…] ны", у часе якога п[…] дпрыемства наладзіць[…] гаварэньні таго ці і[…] лу „Ч. З." з тым […] свайму 10-годзьдз[…] Зьмена" магла выпра[…] якія яшчэ маюцца.

Шырэй асьвятляць міжнароднае стан[…]

Некалькі год таму назад „Чырвоная Зьмена" па свайму зьместу набліжалася да шматтыражкі. За апошні час яна рэзка зьмяніла свой твар. Зьявілася лепшым кіраўнікам і дапаможнікам працаўнай моладзі.

Выкананьне прамфінпляну, ліквідацыя прарываў на вытворчасьці, колектывізацыя вёскі не абышліся без удзелу „Чырвонай Зьмены".

Аднак, у яе працы ёсьць яшчэ рад недахопаў: зусім мала асьвятляецца міжнароднае становішча, а, як мне вядома з вопыту, моладзь у вясковых умовах асабліва сочыць за міжнародным становішчам і толькі па „Чырвонай Зьмене". Неабходна пашырыць міжнародны аддзел, праз які змагацца за павышэньне палітычнага ўзроўню комсамольцаў і працоўнай моладзі.

„Чырвоная Зьмена" на сваіх старонках не адбіла яшчэ організацыі і працы вытворча-бы[…] Неабходна „Чырв[…] абвясьціць конкур[…] бытавую комуну […] годзьдзя.

Недахоп газэты […] яна не заўсёды дав[…] пачатыя ёю справы. […] газэта не праверыла[…] юцца тыя мерапрыем[…] намеціла, даўшы тр[…] аб прарыве на чыгу[…] мольскі колектыў […] палаў павярнуўся т[…] спорту.

Да апошняга часу […] валі паасобна. Зара[…] чала ствараць вакол[…] юнкораўскія брыгады […] кораў уліліся новыя […] рышы.

Брыгадзір „Ч. З.[…]

Узмацніць работу па выхава[…] юнкораў

„Чырвоная Зьмена" заклікана выхоўваць рабочую і бядняцка-серадняцкую моладзь у Ленінскім духу. Трэба практыкаваць зьмяшчэньне на старонках „Ч. З." паасобных папулярных навуковых артыкулаў, бо наша моладзь чытае пераважна толькі „Чырвоную Зьмену" і павінна разумець і разьбірацца ў сутнасьці і карэньнях усіх опортуністычных ухілаў ад лініі партыі.

„Чырвонай Зьмене" патрэбна паставіць і такую задачу, каб юнкораўскія брыгады былі на кожнай фабрыцы, заводзе, колгасе, вёсцы. А для гэтага неабходна заняцца яшчэ большым разгортваньнем масавай работы сярод юнкораў, што дасьць магчымасьць згуртаваць вакол сябе большую а[…] Трэба раз на месяц […] ток пачынаючага ю[…] ваць матар'ял як пі[…] саць, паказваючы не[…] ных допісаў, прыс[…] юнкорамі. У гэтым […] асабліва ў вёсцы мае […] трэбу.

Неабходна заўважы[…] воная Зьнена" часта […] друкаваная так, што […] чытаць. На гэта тр[…] увагу, бо „Чырвон[…] толькі пісьменны, […] менны чытач.

Брыгада „Ч. З."—[…]

Усім колектывам і ячэйкам Л[…]

Гэтым Менгарком ЛКСМБ паведамляе ўсе колектывы і ячэйкі ЛКСМБ, што моладзь, якая не пройдзе мэдагляд, ня будуць дапускацца у Дом адпачынку.

Парадак праходжаньня мэдагляду праз ЦДД наступны:

1. Зав. „Комунар", рымарная і і шчаціннная—да 25-III—31 г.
2. „Энэргія", Хэмфармзавод, друкарня Сталіна—з 25-III па 15-IV—31 г.
3. „Бальшавік" шчоточная, „Беларуска"—з 15-IV па 10-V—31 г.
4. Ф-ка „Акцябр", „Чырвоны тэкстыльшчык"—з 10-V па I-VI—31 г.

Усім яч. і колекты[…] вылучыць таварышоў, […] водзілі гэтую працу.

Прадпрыемствы, як[…] пачынаж з І-га мая, […] тым паведаміць эконо[…] кому ЛКСМБ. Мэд[…] дзень у ЦДД (Зав. Лу[…] ад 7—10 гадз. увечар[…]

Ня ўпамянёныя прад[…] вінны прайсьці мэдаг[…] альбо ў рай. больніца[…]

Заг. эконом.-масав[…] Гаркому ЛКСМБ.[…]

Адказны—рэдактар Мі[…]

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбе[…]